■ Залатое вяселле

# ШЧАСЛІВАЕ СКРЫЖАВАННЕ ЛЁСАЎ,

## або Як гукнеш, так і адгукнецца

**У Хаціславе Маларыцкага раёна прыжылася добрая традыцыя: усёй вёскай у мясцовым Праабражэнскім храме ўшаноўваюць сямейныя пары, якія адзначылі важны юбілей сумеснага жыцця. Вось і сёлета шчырыя пажаданні яшчэ шмат гадоў крочыць па жыцці разам прымалі чатыры сям'і — залатыя і ізумрудныя юбіляры. Як і 50 гадоў таму, у гэты дзень у царкве стаялі поруч Расціслаў Іванавіч і Лідзія Цімафееўна Касьянкі.**

Гавораць, калі лёс прызначыў двум людзям сустрэчу, яна адбудзецца, нягледзячы ні на што. Ні сотні кіламетраў, ні жыццёвыя абставіны не стануць перашкодай. Вось, відаць, і Расціслаў з Лідзіяй былі прызначаны адно аднаму, а іх выпадковае знаёмства — толькі маленькі штрышок у чарадзейным плане лёсу.

На календары быў 1965 год. Украінская дзяўчына Ліда, якая жыла ў Забалацці, збіралася ў дарогу. Яна ехала ў адну з вёсак на Валыні, каб выручыць сястру. Той тэрмінова трэба было на пэўны час вярнуцца дамоў, а кіраўніцтва паляводчай брыгады, дзе яна працавала, згаджалася адпусціць дзяўчыну толькі пры ўмове, што ёй знойдзецца замена. Ці магла падумаць тады Ліда, што ў вёсцы Крахінічы яна не толькі заменіць сястру на рабоце, але і пазнаёміцца з яе былым кавалерам. Калі Расціслаў пабачыў Лідзію, зразумеў: тыя пачуцці, што былі раней, адышлі назаўжды, тым больш што няўдалы раман завяршыўся ўжо даўно. Але ж расказаць каханай пра тое, што звязвала яго з сястрой, не адважыўся. Вельмі зачапіла яго душу прывабная, вясёлая дзяўчына, таму баяўся неасцярожным словам разарваць пакуль яшчэ даволі тонкі ланцужок пачуццяў.

Двух тыдняў рамантычных спатканняў хапіла Расціславу, каб прыняць сур'ёзнае рашэнне і прапанаваць Лідзе пайсці пад вянец.

— Зразумела, за два тыдні характар чалавека не раскрыецца. Але, бывае, доўгія гады людзі разам жывуць, а на якія ўчынкі здольны кожны і як сябе можа павесці, даведваюцца толькі ў нейкай складанай сітуацыі. Я адразу пабачыла, што Расціслаў — хлопец нескупы. Ён кветкі штодня прыносіў, стараўся пачаставаць мяне нечым, — успамінае Лідзія Цімафееўна.

І дзявочая інтуіцыя яе не падвяла. Бо мужа ёй падарыў лёс уважлівага, на ўсе рукі майстравітага, душою шчодрага, уступчывага. Вяселле, якое было для ўсіх нечаканым, усё ж атрымалася на славу. Сястра Лідзіі на былога кавалера зла не трымала, бо адчувала, што гэта не яе палавінка. А сваю знайшла таксама для ўсіх неспадзявана. Проста прыглядзелася ўважлівей да хлопца, які раней сябраваў з Лідзіяй. Такое вось шчаслівае скрыжаванне лёсаў атрымалася.

Маладыя пасля вяселля засталіся жыць на радзіме Расціслава. Лідзія працавала даяркай, была заўжды ў ліку найлепшых, Расціслаў — трактарыстам. У сям'і былі каханне, лад і ўжо трое дзетак, а вось свайго ўтульнага гнязда не было. Маці падказала Лідзіі:

— Вы адпраўляйцеся ў беларускую вёску Хаціслаў, там, я чула, у калгас работнікаў запрашаюць.

Рашучая Ліда адразу сабралася ў дарогу. Старшыня калгаса «Запаветы Леніна» работу маладой сям'і прапанаваў: ёй — жывёлавода, яму — механізатара. І з жыллём паабяцаў дапамагчы, калі згодзіцца сям'я пачакаць, пакуль у старэнькім непрыстасаваным будынку зробяць рамонт. Так Касьянкі сталі хаціслаўскімі жыхарамі. Праўда, тады ніхто і


Залатыя юбіляры Расціслаў і Лідзія КАСЬЯНКІ.

думаць не думаў, што праз некалькі дзесяцігоддзяў суседнія рэспублікі тады яшчэ адзінага Савецкага Саюза раздзеляць межы.

**Сястра Лідзіі на былога кавалера зла не трымала, бо адчувала, што гэта не яе палавінка. А сваю знайшла таксама для ўсіх неспадзявана. Проста прыглядзелася ўважлівей да хлопца, які раней сябраваў з Лідзіяй.**

Паўстагоддзя сямейнага жыцця Касьянкаў прайшло ў клопатах. Што сялянская праца нялёгкая, ведае кожны. А калі яшчэ дома пяцёра па лаўках, дык зразумела, што і расходаў больш, і спраў прыбаўляецца.

— Расціслаў перайшоў у будаўнічую брыгаду, а я ўсё жыццё на ферме працавала. Хоць сям'я вялікая, але дэкрэтнага водпуску і года не назбіраецца. Дзяцей, пакуль яны былі маленькія, на пераменку глядзелі: то ён, то я. Сваякоў жа побач не было, каб папрасіць дапамагчы. Але неяк спраўляліся, затое дружна жылі, — расказвае Лідзія Цімафееўна.

На невялікі дзіцячы садок іх дом падобны і цяпер. Сюды і ўнукі, якіх 14, пастаянна наведваюцца, і траіх праўнучкаў цяпер бабуля з дзядулем гадуюць.

— Гэта ж і ёсць шчасце, калі ў доме шумна, калі дзеці смяюцца, гуляюць, наперабой расказваюць пра свае справы, бягуць па пачастункі, — заўважаюць Касьянкі.

Праўда, давялося ім перажыць і цяжкую трагедыю — смерць сына. Найцяжэй за ўсё, як прызнаюцца, было бачыць, як ад невылечнай хваробы ён згасаў на вачах. Але таму і даецца чалавеку свядомасць, каб умець асэнсаваць і прыняць тое, што нельга змяніць. Падтрымліваючы адно аднаго, яны перажылі гора ці, лепш сказаць, навучыліся жыць з ім і радавацца кожнаму новаму дню.

Ад дома Касьянкаў да праваслаўнага храма ўсяго дзясятак метраў. Гэта Лідзія Цімафееўна заўжды лічыла добрым знакам. Яшчэ калі была маленькая, яе маці, замілоўваючыся чыстым, прыгожым голасам дачкі, не раз гаварыла: яна будзе спяваць у царкоўным хоры. Пра прадказанні матулі ўспомніла жанчына, калі ёй ужо ў сталым узросце прапанавалі прыйсці на рэпетыцыю хору. Яна пайшла і заспявала. Цяпер не прапускае ні адну службу. І, спяваючы, просіць у Бога для сваіх дзяцей, унукаў і праўнукаў добрай долі, верных і надзейных спадарожнікаў, такіх як яе Расціслаў.

У мітуслівых сялянскіх буднях, калі трэба і на падворку за парадкам глядзець, і ў полі з работай справіцца, рэдка знаходзіцца час на святы, нават сямейныя. Вось і залатое вяселле Лідзія Цімафееўна і Расціслаў Іванавіч не збіраліся адзначаць вялікай бяседай. Схадзілі ў царкву, паслухалі віншаванні. А калі вярнуліся дамоў, ажно ахнулі... У двары стаяў вялікі стол з рознымі пачастункамі. Дзеці і ўнукі пастараліся і зрабілі бацькам такі прыемны сюрпрыз. Кожны яшчэ падрыхтаваў свой падарунак. Хто куплены, хто зроблены сваімі рукамі.

— Нядобра хваліцца, але ж як не сказаць: цудоўныя ў нас дзеці, працавітыя, уважлівыя, — гаварылі Касьянкі.

А мне падумалася, што, відаць, правільна выхоўвалі іх бацькі, прыклад ім добры давалі. Не выпадкова ж гавораць: «Як гукнеш, так і адгукнецца».

**Святлана МАКСІМУК**

■ 50+: Жыць цікава

# «МАРУ ЗРАБІЦЬ ІМПРЭЗУ, ПРЫСВЕЧАНУЮ ЭЛЬЖБЕЦЕ ПУЗЫНІ»,

## І ПРАЙСЦІСЯ ПАЛАНЭЗАМ ПА ЛУЧАЙСКІХ МЯСЦІНАХ


Фота Ірыны МАЦКЕВІЧ.

**Алену Генадзьеўну Прохараву ведаюць усе. Невысокая, яркая, рудагаловая, яна, нібы агеньчык, заўжды з'яўляецца на розных культурных імпрэзах. Не запомніць яе рухавую паходку, іскрыстыя вочы ды ўсмешку проста немагчыма. Мяне Алена Генадзьеўна скарыла сваёй адкрытасцю і непасрэднасцю: з першых хвілін знаёмства з ёй можна гаварыць пра ўсё, што заўгодна. Памятаю такі выпадак: два гады таму мы з сябрам ехалі на фестываль «Камяніца» і на выездзе з Мінска ўбачылі знаёмую постаць. Алена Генадзьеўна лавіла падарожны транспарт да Вільні, збіралася дабрацца аўтастопам на музычны фестываль. Язык не паварочваецца назваць гэтую энергічную і напоўненую шчасцем жанчыну пенсіянеркай.**

Падчас сустрэчы раскрываецца таямніца «танцавальнай» паходкі Алены Генадзьеўны: па адукацыі яна харэограф. «Мне хочацца знайсці зерне песні і перадаць яго ў руху», — прызнаецца жанчына. Усё жыццё яна вучыла моладзь адчуваць рытмы.

**Мясцовыя бабулечкі падхапілі мяне пад рукі, павялі ў хату ды кажуць: «На свяце трэба ў строі быць». І я яго набыла. На наступны год прыязджаю, а яны ізноў незадаволеныя: строй ёсць, наміткі няма! Набыла і намітку, а пасля навучылася яе завязваць.**

Аднак і на пенсіі харэографу сумаваць не давялося.

— Цяпер я збіраю фальклор. Аднойчы пазнаёмілася з удзельнікамі «Студэнцкага этнаграфічнага таварыства», а пасля разам з імі з'ездзіла ў экспедыцыю ў Магілёўскай вобласці, — узгадвае яна. — Дакрануцца да жывой з'явы — фальклору — сапраўднае шчасце, бо гэта камунікацыя з неверагоднымі людзьмі. Уявіце сабе бабуль, якім ужо больш за 90 гадоў, а яны могуць маладых хлапцоў перетанцаваць! Адна з іх была ў такіх цудоўных вязаных панчохах... Калі я іх убачыла, то падумала: «Сам Кардэн бы такім пазайздросціў!»

Калі я прашу Алену Генадзьеўну ўзгадаць самыя неверагодныя дні яе жыцця, яна шчыра задумваецца і «апраўдваецца»: «У мяне кожны дзень такі».

— Аднойчы я паехала на абрад «Пахаванне стралы». Пасля шыкоўнага дзейства каля крамы ладзіліся танцы, грала жывая музыка. Як можна было ўстаяць? Адно што ў мяне не было народнага строю. І тут мясцовыя бабулечкі падхапілі мяне пад рукі, павялі ў хату ды кажуць: «На свяце трэба ў строі быць». І я яго набыла. На наступны год прыязджаю, а яны ізноў незадаволеныя: строй ёсць, наміткі няма! Набыла і намітку, а пасля навучылася яе завязваць. Цяпер на ўсіх этнаімпрэзах я ў нацыянальным строі, якога мне сапраўды не хапала.

Заўважаю, што пенсіянеры не надта актыўна наведваюць выставы, а збольшага аддаюць перавагу лецішчу ці ўнукам.

— Мне здаецца, што людзі майго ўзросту проста не ведаюць пра ўсе культурныя мерапрыемствы, — адзначае Алена Генадзьеўна. — Камусьці я распавядаю пра імпрэзы, і яны пачынаюць наведваць выстаўкі, фестывалі. На маю думку, лепш браць з сабой і ўнукаў, каб змалку прывучаць іх да мастацтва. З некаторымі знаёмымі ездзім у Ракаў на танцы. Па нядзелях мы збіраемся ў Мінску ў Музычным завулку і развучваем народныя. Я танцую і рок-н-рол, і ча-ча-ча... Насамрэч, мне не хапае фестываляў! Калі бываю на канцэртах, многія маладыя людзі падыходзяць да мяне. Побач з імі і я адчуваю сябе маладой.

На думку жанчыны, вельмі важна даваць дзецям урокі малявання і спеваў — гэта важныя складнікі для развіцця асобы. Алена Генадзьеўна прызнаецца: «Цяпер мая задача — асвоіць фарбы, магчыма, наведаю майстар-клас па акварэлі». Акрамя таго, яна займалася ў медыямайстэрні сацыяльнага кіно «Эгаліт». Зараз здымае стужкі пра людзей з абмежаванымі магчымасцямі, а таксама шмат робіць для развіцця арт-суполкі імя Тадэвуша Рэйтана. У Грушаўцы, што пад Баранавічамі, захавалася адно з самых вялікіх у Беларусі гумнаў. Старая пабудова патрабуе рамонту: з яго зляцела адна частка даху. Валанцёраў не хапае, хаця ахвотныя дапамагчы і прывесці да ладу археалагічную сведку гісторыі заўжды знаходзяцца. Сёлета ў Грушаўцы адбыўся трэці фестываль імя Тадэвуша Рэйтана — дзеячу споўнілася 275 гадоў. І, вядома ж, не абышлося без Алены Генадзьеўны: яна вучыла мясцовых дзяцей танцаваць паланэз, і па ліпавых алеях яны «прайшліся» гэтым старадаўнім і прыгожым танцам. Дарэчы, на мінулым тыдні была знойдзена надмагільная пліта маці апошняга з Рэйтанаў.

— Адчуваецца энергія людзей, якія змагаліся за гісторыю нашых мясцін. Калі мы не падтрымаем, то іх прамяністасць перадасца і нам, — упэўнена жанчына. — Я вельмі паважаю суполкі, якія займаюцца беларускай культурай і гісторыяй. Мая мара — зрабіць імпрэзу, прысвечаную мэцэнатцы, заснавальніцы астранамічнай абсерваторыі ў Вільні Эльжбеце Пузыні (Агінскай), і прайсціся паланэзам па Лучайскіх мясцінах, дзе яна жыла.

**Кацярына РАДЗЮК**